**Вучэбная дысцыпліна “Літаратурнае рэдагаванне”**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 – 0232-01 “Беларуская філалогія. Прафілізацыя”: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць<br>кампанент установы вышэйшай адукацыі<br>модуль “Стылістычнае і літаратурнае рэдагаванне”: |
| **Кароткі змест** | Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна. Тэкст як аснова творчай працы рэдактара. Псіхалагічныя перадумовы рэдагавання. Методыка рэдактарскага аналізу і ацэнкі аўтарскага твора. Прафесійнае рэдактарскае чытанне і рэдактарская праўка як аснова творчай працы рэдактара. Лагічныя асновы рэдагавання. Рэдактарскі аналіз кампазіцыі і загалоўкаў. Рэдагаванне фактычнага матэрыялу літаратурнага твора. Віды тэкстаў паводле спосабу выкладу і асаблівасці іх рэдагавання. Методыка моўна-стылёвага аналізу і праўкі тэксту. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт **павінен ведаць**:<br>- тэарэтычныя асновы падрыхтоўкі аўтарскага рукапісу да друку;<br>- творчы працэс “ад аўтарскага рукапісу –да друкаванага выдання”;<br>- методыку рэдактарскага аналізу аўтарскага твора;<br>- прыёмы рэдактарскай і карэктарскай праўкі;<br>**павінен умець:**<br>- прафесійна, кваліфікавана рабіць рэдактарскі аналіз аўтарскага твора на прадмет яго грамадскай значнасці;<br>- ацэньваць актуальнасць тэмы, узровень яе распрацоўкі;<br>- вызначыць моўна-стылёвую якасць тэксту;<br>- выпрацаваць слушныя рэкамендацыі для аўтара дзеля ўдасканалення твора ў інтарэсах самога аўтара (адрасанта) і чытача (адрасата);<br>- рабіць канчатковую, тэарэтычна абгрунтаваную, рэдактарскую праўку тэксту на падставе метадычных рэкамендацый, якія вызначаюць межы рэдактарскага ўмяшання ў аўтарскі тэкст;<br>- рэдагаваць аўтарскі твор з выкарыстаннем сучасных камп’ютарных тэхналогій.<br>Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста:<br>СК-6. Кваліфікавана ацэньваць стылістычныя і эстэтычныя характарыстыкі публіцыстычнага і мастацкага тэксту. |
| **Прэрэквізіты і пострэквізіты** | “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Уводзіны ў літаратуразнаўства”, “Стылістыка”, “Сучасная беларуская мова”, “Сучасная руская мова”, “Псіхалогія літаратурнай творчасці” |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін – 90; аўдыторная колькасць гадзін – 34, з іх: лекцыі – 14, практычныя заняткі – 14, кіруемая самастойная работа (КСР) – 6, 3 заліковыя адзінкі. |
| **Семестр, формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 6-ы семестр, тэст, экзамен |